*Валянціна Новак*

# ЖНІЎНАЯ АБРАДНАСЦЬ І ПАЭЗІЯ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

Структура жніўнай абраднасці, у якой арганічна пераплецены «асноўныя ідэі ўсяго земляробчага календара – пачатак і завяршэнне, завяршэнне і пачатак» [2, *222*] і занатаваны працоўны вопыт чалавека, складаецца з некалькіх частак: зажынкі, уласна жніво і дажынкі. «Жыта, найважнейшая збожжавая культура беларусаў, значна міфалагізаваная ў народнай свядомасці. … Жыта раўназначна багаццю, раю, назва «рай» захавалася ў абрадзе дажынак і абрадавых зажыначных песнях» [1, *175*]. Звернемся да характарыстыкі жніўных абрадаў і звычаяў, звесткі пра якія зафіксаваны ў розных раёнах Гомельскай вобласці. Як адзначылі жыхары в. Сялец Буда-Кашалёўскага раёна, у іх мясцовасці надзвычай сур’ёзна рыхтаваліся да пачатку жніва: «… вымывалі ўсё ў хаце, упрыгожвалі ўсё кветкамі, пеклі святочны хлеб, апраналіся ў чыстыя вопраткі». З такой жа адказнасцю рыхтаваліся да пачатку жніва і ў вёсках Брагінскага раёна: «Перад зажынкамі мыўся пол, бялілася печ. Засцілаўся чысты абрус, усе апраналіся ў вышыванае красівае адзенне» (запісана ў в. Лубенікі ад Ганны Севасцьянаўны Гайдук, 1922 г. н.).

Паводле сведчанняў жыхароў в. Старое Сяло Веткаўскага раёна, абавязкова напярэдадні зажынак асвячалі поле: «Штобы быў добры ўраджай, хадзілі асвячаць поле … Мая бабуля ўсегда сама эта дзелала. Возьме бутэлечку з вадою і пайшла па лугу, а пад нос прыгаворвае што-та» (запісана ад Матроны Сяргееўны Васільцовай, 1925 г. н.). У в. Залаты Рог імкнуліся задобрыць ніву, з гэтай мэтай «кідаем у жыта ў белым палаценцы хлеб і ваду» (запісана ад Вольгі Цімафееўны Лук’яненка, 1935 г. н.).

Матыў ушанавання першага снапа звязаны найперш з яго назвай «гаспадар»: «Першы сноп называлі «гаспадар». Яго маглі ставіць на покуці» (запісана ў в. Лубенікі ад Ганны Севасцьянаўны Гайдук, 1922 г. н.). Этнаграфічныя звесткі пра жніўную абраднасць, запісаныя ў вышэйназванай вёсцы, даюць падставы сцвярджаць, што ў зажынках, якія з’яўляліся пачаткам жніва, знайшлі яскравае адлюстраванне хрысціянскія ўяўленні: «Перад тым, як жаць першы сноп, яны прасілі ў Бога:

*Госпадзі Божа, памажы,*
*Першую палосачку прымаці*
*Ды сто снапоў жыта нажаці.*
*Госпадзі Божа, памажы*
*Ды сноп пакажы».*

У зажынкавых абрадах і песнях таксама мелі месца і язычніцкія вераванні (зварот да сонца):

*«Я жала ды пажынала,*
*Ды на сонейка пазірала.*
*Ці высока сонейка, пазірала,*
*Ці высока сонейка, ці нізка?»* (в. Сялец Брагінскага раёна).

Вялікае магічнае значэнне надавалі першаму нажатаму снапу: «Першы сноп вельмі шанавалі (яго абвязвалі яркай хусцінкай), неслі дадому, пасвяцалі на Спаса ў цэркві і захоўвалі да наступнага пасева» (запісана ў в. Сялец ад Марыі Кірылаўны Сцепаненка, 1926 г. н.). Яскрава выражаны хрысціянскія вераванні і ў апісанні абраду зажынак у в. Казялужжа Хойніцкага раёна: «Як паспее жыта, дак ідзе хазяін зажынаць. Нажне дзве жменькі і ложыць крэсцікам на полі, на том месці, дзе выжаў. Ета абычай быў такі» (запісана ад Еўдакіі Пятроўны Чэкан, 1917 г. н.).

З зажынкамі як пачатковым абрадавым этапам жніўнай абраднасці былі звязаны міфалагічныя ўяўленні, напрыклад, у мясцовай традыцыі в. Ястрабка Лоеўскага раёна было прынята, каб «зажынала сільна крэпкая жэншчына і не бальная, штоб усім добра было» (запісана ад Ганны Рыгораўны Коўзік, 1928 г. н.). Калі зажыналі жыта на першы сноп, то абавязкова прыгаворвалі: «Дай жа, божачка, каб лёгка жалась, сярэдзінка не балела, ручачкі не млелі, ножачкі не дзервянелі, галава не гарэла» (запісана ад Кацярыны Сцяпанаўны Смалянчук, 1921 г. н.).

Паводле сведчанняў Праскоўі Іосіфаўны Прэндзіч, 1910 г. н., з в. Усохі Добрушскага раёна, звычайна пачыналі жаць «у аўторак ці ў суботу, на чацвёрты дзень пасля Пятра». Для выканання рытуалу зажынання першых каласоў выбіралі у гэтай вёсцы жанчыну «па натуры робкую, не сварлівую, каб было лёгкае жніво, добрую гаспадыню». Паводле сведчанняў жыхароў в. Жгунь Добрушскага раёна, «а першы сноп жаць выбіралі здаровую жанчыну, каб быў добры ўраджай» (запісана ад Алены Маркаўны Сакалоўскай, 1929 г. н.).

Адказ на пытанне, чаму такія высокія патрабаванні прад'яўляліся да выканаўцаў рытуалаў, звязаных з першымі каласамі, можна знайсці ў этнаграфічных апісаннях жніўнага абраду, зробленых у в. Будка Рэчыцкага раёна: «На каторы год зажне першай жыта жэншчына маладая, чыстая – то калі будуць жаць і парэжаш палец ці што другое, не будзе гнаіцца, не будзе балець. А калі першай зажне якая-небудзь няўдалая жанчына ці бальная, усё жніво будуць то нарывы, то раны. Потым тую жанчыну клялі» (запісана ад Таццяны Іванаўны Белавус, 1924 г. н.). Зыходзячы з народных вераванняў жыхароў в. Дублін Брагінскага раёна, зажынаць жыта павінна была «жанчына здаровая, крэпкая. Выбіралі 2–3 крэпкіх жанчын. Як баляць рукі, то кажуць, што паслалі паганую» (запісана ад Ніны Іванаўны Скрыпчанка, 1944 г. н.). Як адзначылі інфарманты з в. Вятхінь Рэчыцкага раёна, у іх мясцовасці зажынала жыта спачатку адна старая жанчына, а на другі дзень далучаліся іншыя жнеі: «Гэта рабілі, каб, калі жалі, спіны не балелі, пальцаў не адразалі» (запісана ад Любові Антонаўны Нарнецкай, 1919 г. н.). Пакладзены ў жыта хлеб на ручніку, а таксама налітая ў пасудзіне вада, зыходзячы з вераванняў жыхароў в. Залаты Рог Веткаўскага раёна, павінны былі «задобрыць поле» (запісана ад Вольгі Цімафееўны Лук'яненка, 1935 г. н.).

У некаторых мясцовасцях Гомельшчыны з рытуалам зажынання першых каласоў было звязана прагназаванне лепшых якасцей характару жаніха: «Калі якая дзяўчына сабіралася замуж у гэтую восень, уставала раней усіх, ішла на поле і зажынала на кожнай паласе хай па некалькі калассяў, каб

жаніх меў многа добрых якасцей. Лічылася, што ўсе, з чыіх палос зажыналася дзяўчынай, павінны былі абавязкова прыйсці да яе на вяселле» (запісана ў г. Добруш ад Ганны Серафімаўны Грамыка, 1929 г. н.). Паводле сведчанняў жыхароў Добрушчыны, каб у будучым захаваць салому ад мышэй, трэба было перад тым, як пачаць зажынкі, змазаць серп пасвечаным салам: «На зажынкі, як прыйдзе на поле, бярэ сала і мажа ім серп, сама свяцоным, што пасвяцілі на Пасху. Ета дзелалі, штоб салому не елі мышы» (запісана ад Ефрасінні Пятроўны Мухінай, 1919 г. н.). Каб не балела спіна у жней падчас цяжкай працы жніва, калі выходзілі зажынаць першыя каласы, то рабілі з саломы перавясла і падвязваліся ім: «Ну, ек ідом первуй раз жаць жыта, то нажынаем по жмені і завіваем перэвесло і подвязваемса перэвеслом по поесніцы, шчоб не болела спіна» (запісана ў в. Сіманічы Лельчыцкага раёна ад Ганны Андрэеўны Федаровіч). У в. Буйнавічы Лельчыцкага раёна, калі зажыналі, то, каб не балела спіна, «з дуба за паясніцу затыкаюць ветку» (запісана ад Галіны Сцяпанаўны Бабовіч, 1936 г. н.).

Абавязковымі падчас зажынак былі хлеб і соль: «Ну, як жыта зажыналі, дык у нас у сяле ўсягда была адна такая бадзёрая баба. … Яна ўжэ бярэ лусту хлеба, солькі туды топча і пайшлі, серпік бярэ». Зварот да Бога з просьбай дапамагчы ў гэтай высакароднай справе атрымання добрага ўраджаю папярэднічаў працэсу зажынання каласоў для першага снапа: «Ну, дай Госпадзі, шчоб не було ні грому, ні маланкі, ні вялікага дажджа, шчоб так усё добра прайшло, шчоб сабе серпікамі рук не паабразалі. Дай нам, Госпадзі, пажаць да і увесь хлеб сабраць» (запісана ў в. Баршчоўка Добрушскага раёна ад Валянціны Гаўрылаўны Грудавенка, 1930 г. н.). Зажынкі ў в. Гарысты Калінкавіцкага раёна таксама суправаджаліся славеснымі формуламі-прыгаворамі, у якіх звярталіся да Бога паспрыяць у працы на ніве: «Божа, памажы, спор у працы пакажы, а дрэнным людзям грудзі завяжы», «Госпадзі Божа, памажы першую палосачку зжаці, бы сто снапочкаў нажаці» (запісана ад Ганны Іванаўны Данілёнак, 1946 г. н.). Прыведзеныя ўзоры славесных формул – пацвярджэнне наяўнасці ў абрадавай творчасці вярбальнага кода. Даследчыца Г. А. Барташэвіч, аналізуючы жніўную абраднасць беларусаў, невыпадкова звяртаецца да пераліку кодаў, які прыводзіць С. М. Талстая: «… значымыя элементы абраду належаць некалькім розным кодам: акцыянальнаму (рытуальныя дзеянні), прадметнаму (рэаліі, якія выступаюць у якасці аб’ектаў, прылад або прадуктаў дзеяння), персанажнаму (выканаўцы, адрасаты або аб’екты дзеянняў, рэальныя або міфалагічныя), лакатыўнаму (рытуальна адзначаныя локусы дзеянняў, прадметаў, персанажаў), тэмпаральнаму (часавыя моманты ці адрэзкі, да якіх прымеркаваны дзеянні), вярбальнаму (слоўныя тэксты, тэрміналогія, імёны) …» [2, *224*].

Паводле мясцовых вераванняў, каб забяспечыць добрае надвор’е, каб не было дажджу, трэба спачатку пакачацца па жыце: «У пачатку качаліся па жыту, каб у час жніва не было дажджу» (запісана ў в. Гарысты Калінкавіцкага раёна ад Ганны Іванаўны Данілёнак, 1946 г. н.).

Завяршэнне жніва – дажынкі – суправаджалася адпаведнымі рытуаламі і песнямі. На тэрыторыі Гомельшчыны быў вядомы дажынкавы абрад пад

назвай «барада»: «Калі канчалі дажынаць, на сваёй ніве кажды кідаў «бараду»: звязвалі жыта на сцірні. Прыбіралі бараду лентамі, лажылі ў яе хто сала, хто яйцо, хто печыва» (запісана ў в. Усохі Добрушскага раёна ад Праскоўі Іосіфаўны Прэндзіч, 1910 г. н.). «У цэнтры абраднасці гэтага этапу – апошні сноп, яго ўшанаванне. Яму надавалася бадай што большае значэнне, чым першаму, з ім звязаны і розныя рытуалы, павер’і, яго па-рознаму называлі ў розных народаў і ў розных мясцовасцях» [2, *234*]. Напрыклад, у в. Насовічы Добрушскага раёна гэты абрад быў вядомы пад назвай «каза»: «На дажынкі дзелалі казу (сплятаалі лентай жыта і клалі ў сярэдзіну яду)» (запісана ад Клаўдзіі Пятроўны Баравой, 1932 г. н.).

Да выканання рытуалаў завівання барады прад’яўляліся пэўныя патрабаванні: напрыклад, трэба было ўсё рабіць моўчкі і левай рукой, што пацвярджае ўскосна сувязь гэтага абраду з культам продкаў: «Бараду завівалі моўчкі і рабілі ўсё левай рукой» (запісана ў г. Светлагорску ад Ларысы Паўлаўны Андрэйчыкавай, 1949 г. н.). Аб сувязі дажынкавай абраднасці з культам продкаў сведчаць не толькі вышэйназваныя патрабаванні выконваць дзеянні, звязаныя з абрадам «барады», моўчкі і левай рукой, але і, як адзначылі жыхары г. Светлагорска, «затым лажылісь на ніву і трэба было паляжаць з закрытымі вачыма», што сімвалізавала таксама магічную сувязь з іншасветам (запісана ад Ларысы Паўлаўны Андрэйчыкавай, 1949 г. н.). Важнасць дажынкавага абраду «барады» ў структуры жніўнай абраднасці была абумоўлена, паводле сведчанняў жыхароў в. Маркавічы Гомельскага раёна, неабходнасцю забяспечыць багаты ўраджай жыта: «… а бараду астаўлялі, штоб у следуюшчый год було много жыта, каб зямля не вырадзіла і ў дзярэўне многа хлеба було» (запісана ад Антаніны Мікалаеўны Сявуцкай, 1925 г. н.). З апошнім дажынкавым снапом таксама звязвалі надзеі на будучы добры ўраджай жыта, невыпадкова «сноп ставілі в угол на целый год, чтобы был хороший урожай» (запісана ў г. Гомель ад Ніны Генадзьеўны Хвастовай, 1943 г. н.).

З абрадам «завівання барады» былі звязаны цікавыя прыкметы і павер’і, напрыклад, у в. Кавалёў Рог Чачэрскага раёна, «цяжарныя жанчыны пільна ўглядваліся ў траву ля «барады»: калі прапаўзе павучок – будзе хлопчык, калі чорная казявачка – дзяўчынка» (запісана ад Ганны Васільеўны Кудзінавай, 1931 г. н.). Падчас дажынак дзяўчаты імкнуліся вызначыць, як хутка яны выйдуць замуж: «Хто, жнучы, можа абагнаць сваіх саперніц на даўжыню чалавечай постаці, той хутчэй замуж пойдзе» (запісана ў в. Крупец Добрушскага раёна ад Галіны Акімаўны Данчанка, 1922 г. н.).

Заслугоўваюць увагі рытуалы, звязаныя з абрадам «барады», які выконвалі падчас дажынак у в. Крупец Добрушскага раёна. Па-першае, трэба было абавязкова прапалоць траву «ў барадзе паміж сцяблінкамі жыта», але «не голымі рукамі, а праз рукаў. Казалі, што калі палоць голай рукой, на зямлі нічога не стане расці» (запісана ад Галіны Акімаўны Данчанка, 1922 г. н.). Па-другое, «перакочванне» жней «каля завітага куста» павінна было забяспечыць добры ўраджай жыта ў будучым годзе», мыццё рук жнеямі пасля заканчэння дажынак, паводле мясцовых народных вераванняў, павінна

было забяспечыць чысціню жыта, перавязванне саломай або травой сярпоў – засцерагчы рукі жней ад парэзу: «Устаўшы з зямлі, жнеі мылі рукі, каб на лета было чыстае жыта, перавязвалі саломай або травой сярпы, каб на будучы год не парэзаць рук у час жніва» (запісана ад Галіны Акімаўны Данчанка, 1922 г. н.).

У в. Карма Добрушскага раёна абліванне жнеямі «барады» вадой, зыходзячы з народных уяўленняў, сімвалізавала магічнае выкліканне дажджу: «Усё [пакінутае для барады жыта] завязваюць, паліваюць вадой, каб ішоў дождж» (запісана ад Івана Іванавіча Казаннікава, 1931 г. н.). Зярняткі з апошняга снапа, які прыносілі з поля дадому і захоўвалі каля абразоў, дабаўлялі «ў насенне, перад тым, як сеяць» (запісана ў в. Ясенкі Добрушскага раёна ад Марыі Пятроўны Сматрэнка, 1922 г. н.). У в. Астражанка Лельчыцкага раёна, калі дажыналі на полі жыта і яго ўжо заставалася мала, «мо на адзін сноп, тады ўсе жанкі пачынаюць полоць сорнае зелье ў етым жыце, «рваць бороду».За імі ідзе молодшая дзеўка і не серпом, а рукамі вырывае остатнее жыто. Колі ўсё жыто вырванэ, то его раздзеляе етая ж дзеўка на дзве столкі і ложыць крэстом. Остальные жанкі по етому крэсту раскладваюць хлеб» (запісана ад Надзеі Іванаўны Голік, 1920 г. н.).

Прыведзеныя матэрыялы па жніўнай абраднасці з’яўляюцца яскравым пацвярджэннем арганічнага адзінства акцыянальнага і вярбальнага кампанентаў, а таксама дэманструюць багацце лакальных асаблівасцей, цесную сувязь жніўных абрадаў і звычаяў з прыкметамі і павер’ямі.

**ЗАЎВАГІ**

*1. У артыкуле выкарыстаны матэрыялы фальклорнага архіва кафедры беларускай культуры і фалькларыстыкі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Беларуская міфалогія: Энцыклапед. слоўн. / С. Санько [і інш.]; склад. І. Клімковіч. – 2-ое выд., дап. – Мінск: Беларусь, 2006. – 599 с.

2. Узроўні агульнасці фальклору ўсходніх славян / Л. П. Барабанава, Г.А. Барташэвіч, К. П. Кабашнікаў і інш. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 477 с.